Дадатак

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзенні фестывалю народнай творчасці «Беларусь родная, музычная, народная»

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення ў 2022-2023 гадах фестывалю народнай творчасці «Беларусь родная, музычная, народная» (далей – фестываль).

2. Мэтамі фестывалю з’яўляюцца:

адлюстраванне поспехаў раёнаў Магілёўшчыны ў розных сферах, папулярызацыя багатай гістарычнай палітры рэгіёна;

папулярызацыя культурных, гістарычных, турыстычных брэндаў Магілёўскай вобласці;

захаванне беларускай нацыянальнай культуры, нацыянальнай самабытнасці, беларускіх традыцый і звычаяў;

захаванне гістарычнай памяці, умацаванне адзінства беларускага народа;

патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, фарміраванне ў моладзі каштоўнасцей гераізму, патрыятызму, любові да Радзімы;

выяўленне і падтрымка таленавітай моладзі, яркіх, самабытных талентаў мастацкай творчасці, маладзёжных праектаў і дасягненняў;

дэманстрацыя працоўных подзвігаў грамадзян (у тым ліку пакалення незалежнай Беларусі), прадстаўнікоў розных пакаленняў і прафесій;

дэманстрацыя спартыўных дасягненняў;

дэманстрацыя талерантнасці беларускага грамадства, сацыяльнай арыентаванасці дзяржавы;

удасканаленне працы з рэжысёрамі, мастацкімі кіраўнікамі, падтрымка рэжысёрскага майстэрства;

актывізацыя работы калектываў мастацкай творчасці, выканаўцаў Магілёўшчыны незалежна ад ведамаснай прыналежнасці;

развіццё ўсіх відаў і жанраў аматарскай творчасці;

папулярызацыя беларускіх народных мастацкіх рамёстваў, абмен вопытам работы па іх захаванні і развіцці сярод удзельнікаў, выяўленне і павышэнне творчага ўзроўню майстроў народных мастацкіх рамёстваў;

арганізацыя культурнага вольнага часу наведвальнікаў і гасцей фестываю.

3. Фестываль праводзіцца пры падтрымцы Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта. Арганізатарам фестывалю з’яўляецца ўпраўленне культуры Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, выканаўца – установа культуры «Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветнай работы» (далей – абласны метадычны цэнтр).

4. Фестываль згодна грфіку праводзіцца з красавіка 2022 г. па лістапад 2023 г.

| Дата правядзення* | Раёны |
|---|---|
| 14.04.2022 | Бабруйскі |
| 12.05.2022 | Круглянскі |
| 16.06.2022 | Шклоўскі |
| 08.09.2022 | Бялыніцкі |
| 22.09.2022 | Глускі |
| 06.10.2022 | Кіраўскі |
| 10.11.2022 | Быхаўскі |
| 15.12.2022 | Клічаўскі |
| 19.01.2023 | Асіповіцкі |
| 16.02.2023 | Горацкі |
| 16.03.2023 | Дрыбінскі |
| 13.04.2023 | Мсціслаўскі |
| 18.05.2023 | Крычаўскі |
| 15.06.2023 | Хоцімскі |
| 24.08.2023 | Клімавіцкі |
| 07.09.2023 | Касцюковіцкі |
| 21.09.2023 | Краснапольскі |
| 12.10.2023 | Чэрыкаўскі |
| 26.10.2023 | Магілёўскі |
| 09.11.2023 | Слаўгарадскі |
| 23.11.2023 | Чавускі |

** Магчымы змяненні і дапаўненні па датах правядзення.*

5. Падчас правядзення фестывалю адбудзецца конкурс па наступным намінацыям:

«Лепшая канцэртная праграма» (кожны раён прадстаўляе канцэртную праграму згодна патрабаванняў, адзначаных ў пунктах 7, 8).

«Лепшая выстава-прэзентацыя» (кожны раён прадстаўляе выставу-прэзентацыю згодна патрабаванняў, адзначаных у пункце 9).

6. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца калектывы мастацкай творчасці, індывідуальныя выканаўцы, творчыя групы, майстры народных мастацкіх рамёстваў, мастакі, рамеснікі, умельцы, іншыя ўдзельнікі незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

7. Канцэртная праграма, якая прадстаўляецца адным раёнам, павінна быць агульнай працягласцю каля 90 хвілін і адпавядаць наступным патрабаванням:

**Пралог** – масавая калажная кампазіцыя, якая адлюстроўвае культурныя, гістарычныя, турыстычныя (іншыя) брэнды раёна з элементамі тэатралізацыі з масавымі дзействамі, вакальна-харэаграфічнымі карцінкамі.

**Тэматыка нумароў прадугледжвае:**

**«Год гістарычнай памяці»** – творчыя нумары, сюжэтныя дзействы якога павінны пазнаёміць з гістарычнай палітрай раёнаў Магілёўшчыны, адлюстроўваць гістарычныя эпізоды і хронікі розных часоў і падзей;

**«Наша моладзь»** – творчыя нумары, якія прэзентуюць таленты і поспехі моладзі ў розных сферах (у тым ліку – спартыўнай), лепшыя моладзежныя праекты. На сцэне можа выступаць патрыятычная, таленавітая моладзь у розных жанрах, у тым ліку сучасныя блогеры, каманды клуба вясёлых і знаходлівых, каманды па брэйк-дансу, дыджэі, рэп-выканаўцы, чырлідзеры, сучасныя гурты і іншае;

**«Нашы людзі»** – творчыя нумары, які могуць быць прадстаўлены ў розных формах, у тым ліку, як выступленне-мітынг. Запрошаныя спікеры, прамоўцы закранаюць цікавыя і сацыяльна значныя тэмы. Нумары таксама могуць прадстаўляць прадстаўнікоў значных прафесій: працаўнікоў, абаронцаў Айчыны, медыцынскіх работнікаў, пасляховых сямейных дынастый, людзей іншых нацыянальнасцей, персаналій, якімі ганарыцца раён. Форму прадстаўлення нумароў вырашае рэжысёр раёна;

**«Танчым разам»** – харэаграфічныя нумары, якія могуць уключаць у сябе розныя напрамкі: класічны, народны, бальны, сучасны, гісторыка-бытавы, эстрадны і г.д. Харэаграфічныя нумары могуць быць як самастойнымі, так і ў спалучэнні з ансамблем або салістамі;

**«Душа народная»** – нумары, якія могуць быць прадстаўлены ў розных формах, у тым ліку выступленні вакальных творчых калектываў або індывідуальных выканаўцаў з абавязковым выкананнем беларускай народнай песні, а так сама гарманістаў і прыпевачнікаў, выканаўцаў на народных інструментах і прыладах і г.д.;

**«Эстрада»** – творчыя нумары, якія могуць быць выкананы ў розных жанрах і сцэнічных формах, такіх як вакальнае або інструментальнае выкананне, мастацкае чытанне, сцэна з драматычнага спектакля, выкананне класічных музычных твораў і г.д.

**Фінал** – творчы нумар на патрыятычную тэматыку, які павінен быць самым яскравым, масавым і відовішчным, мець скончаны выгляд, адпавядаць тэме (форме) канцэрта, з абавязковым выкарыстаннем атрыбутыкі.

8. Для правядзення конкурснай праграмы фестывалю ствараецца журы з ліку спецыялістаў абласнога метадычнага цэнтра.

Конкурсныя праграмы ацэньваюцца па наступных крытэрыях: выканальніцкае майстэрства, раскрыццё музычна-мастацкага вобраза, рэжысура канцэртнай праграмы, сцэнічная культура, дакладнасць і вобразнасць спосабаў выразу ідэі конкурснай праграмы.

9. **«Лепшая выстава-прэзентацыя»** – у конкурсе прымаюць удзел майстры раённых Дамоў (Цэнтраў) рамёстваў, студый дэкаратыўна-прыкладной творчасці ўстаноў культуры, індывідуальныя майстры. Раёны могуць прадстаўляць экспазіцыі, выставы твораў традыцыйных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, рамесніцкіх вырабаў, традыцыйных народных касцюмаў, дэгустацыю і прэзентацыю традыцыйных страў нацыяльнай кухні, прэзентацыю навуковых, метадычных, літаратурных выданняў, экспазіцыю якая адлюстроўвае турыстычны патэнцыял рэгіёна і іншае.

У тэматыцы і змесце конкурсных работ могуць адлюстроўвацца сюжэты і падзеі, у тым ліку былінныя, абрадавыя, казачныя, літаратурныя і гэтак далей.

10. Па выніках правядзення фестывалю пераможцы будуць ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені па кожнай намінацыі. Канкурсанты, якія не занялі прызавыя месцы, узнагароджваюцца дыпломамі ўдзельніка.

Журы мае права прысуджаць спецыяльныя дыпломы.

11. Выдаткі, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем фестывалю, ажыццяўляюцца за кошт крыніц, не забароненых заканадаўствам, з удзелам – за кошт накіроўваючага боку, а таксама іншых.

12. Кантактныя дадзеныя для рашэння арганізацыйных пытанняў: аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці абласнога метадычнага цэнтра тэл. 8 (0222) 42 42 64.